# Раздзел III. РАЗВІЦЦЁ СУСВЕТНЫХ ЦЫВІЛІЗАЦЫЙ У ПОЗНІМ СЯРЭДНЯВЕЧЧЫ. БЕЛАРУСЬ У ПЕРЫЯД ВЯЛІКАГА КНЯСТВА ЛІТОЎСКАГА, РУСКАГА І ЖАМОЙЦКАГА

## § 20. Асноўныя тэндэнцыі палітычнага развіцця цывілізацый у Познім сярэдневеччы

ПАРЛАМЕНТ СОЙМ
ГЕНЕРАЛЬНЫЯ ШТАТЫ РЭЙХСТАГ
САСЛОЎНАЕ ПРАДСТАЎНІЦТВА
УСХОДНЯЯ ДЭСПАТЫЯ КАРТЭСЫ
МАНАРХІЯ КАРОЛЬ РЭСПУБЛІКА
ЦЭНТРАЛІЗАВАНАЯ ДЗЯРЖАВА

Цэнтралізацыя дзяржаў у Заходняй Еўропе

**1. Стварэнне цэнтралізаваных дзяржаў.** З XI–XII стст. у Заходняй Еўропе на фоне паступовага эканамічнага росту і, адпаведна, павелічэння колькасці насельніцтва пачаўся працэс кансалідацыі дзяржаўнай улады вакол каралеўскіх дынастый.







ГРАНІЦЫ
- Свяшчэннай Рымскай імперыі
- англійскіх уладанняў у Францыі да 1337 г.
- Французскага каралеўства пасля заканчэння Стогадовай вайны (афіцыйна)

ТЭРЫТОРЫІ
- ва ўладанні буйных французскіх феадалаў
- ва ўладанні англійскага караля ў Францыі да 1180 г.
- рэальна падуладныя французскаму каралю да 1453 г.

1307 Гады далучэння зямель да французскай кароны

ГРАФСТВА ФЛАНДРЫЯ Землі, не падуладныя французскаму каралю ў 1453 г., але населеныя французамі

*Францыя і Англія ў XIII — пачатку XIV ст.*

*Францыя і Англія з 1453 да 1490-х гг.*

Параўнайце дзве палітычныя карты. Які працэс назіраўся ў краінах Заходняй Еўропы ў Познім сярэднявеччы (на прыкладзе Францыі)?

Адначасова адбывалася дынамічнае развіццё гарадоў, фарміраваўся ўнутраны рынак. Гараджане — раметнікі і купцы — былі зацікаўленыя ў мірным стваральным жыцці, бяспечных дарогах і перавозках тавараў, што было немагчыма гарантаваць пры феадальным самавольстве.

**Цэнтралізаваная дзяржава** — дзяржава, у якой тэрыторыя краіны падпарадкоўваецца аднаму цэнтру, дзейнічае адзіная сістэма кіравання і заканадаўства.

Не здзіўляе, што гараджане занялі бок манархаў у жаданні апошніх умацоўваць сваю ўладу. Падтрымка была перш за ўсё матэрыяльная, што дазваляла каралям фарміраваць замест непакорлівага рыцарскага апалчэння больш дысцыплінаваныя наёмныя войскі. Рост гарадоў у Заходняй Еўропе дазволіў манархам умацаваць сваю ўладу і супрацьстаяць самавольству арыстакратыі. Гэта спрыяла паступовай **цэнтралізацыі дзяржаў**.

Слабасць каралеўскай улады ў Цэнтральнай Еўропе

У перыяд Позняга сярэднявечча ў дзяржаўным і грамадскім развіцці краін Цэнтральнай Еўропы меліся асаблівасці. Па-першае, слабасць гарадоў, звязаная з марудным фарміраваннем гандлёва-эканамічных сувязей унутры дзяржаў гэтага рэгіёна. Па-другое, вольныя сельскія рамеснікі, у адрозненне ад заходнееўрапейскіх сабратаў, не імкнуліся пакідаць свае вёскі, таму гарадское насельніцтва ў Польшчы, Чэхіі і Венгрыі расло павольна. Гараджане ў сувязі з гэтым не маглі даць манархам рэсурсы для цэнтралізацыі ўлады, як гэта адбывалася на Захадзе. У такіх умовах каралі ў супрацьстаянні з мясцовай арыстакратыяй маглі разлічваць выключна на дапамогу дваранства — шляхты. У выніку каралеўская ўлада ў дзяржавах Цэнтральнай Еўропы была дастаткова слабая.

Успомніце, што ўяўляла сабой Свяшчэнная Рымская імперыя ў Познім сярэднявеччы.

Лёс паўднёваславянскіх народаў

Падобным чынам развіваліся паўднёваславянскія краіны. Тут, асабліва ў Балгарыі і Сербіі, быў заўважны ўплыў візантыйскага палітычнага ладу і праваслаўнай царквы. Але праз турэцкую агрэсію ў XIV ст. рух рэгіёна да цэнтралізацыі быў перапынены, і паўднёвыя славяне падзялілі лёс іншых балканскіх народаў.

**2. Фарміраванне саслоўна-прадстаўнічых органаў.** Неабходнасць для каралёў абапірацца на шырокія пласты насельніцтва пацягнула за сабой узнікненне саслоўна-прадстаўнічых органаў улады. На іх пасяджэнні манархі склікалі найбольш уплывовых феадалаў. З улікам ролі царквы ў сярэднев-

## УЗНІКНЕННЕ САСЛОЎНА-ПРАДСТАЎНІЧЫХ ОРГАНАЎ

- **1137 г.** — Картэсы, *Кастылія (Іспанія)*
- **1265 г.** — *Англія*, Парламент
- **1302 г.** — Генеральныя штаты, *Францыя*
- **1435 г.** — *Швецыя*, Рыксдаг
- **XV ст.** — Сойм, *Вялікае Княства Літоўскае*
- **1495 г.** — *Свяшчэнная Рымская імперыя (Германія)*, Рэйхстаг

ковай Еўропе сваё месца ў саслоўна-прадстаўнічых органах усіх дзяржаў заняло каталіцкае духавенства. Узмацненне палітычнага ўплыву гарадоў і іх гаспадарчага значэння абумовіла запрашэнне на гэтыя пасяджэнні прадстаўнікоў гараджан. Больш за тое, часам разам з імі засядалі і вольныя сяляне, аднак гэта было хутчэй выключэннем. Такім чынам, у Познім сярэднявеччы ў большасці еўрапейскіх дзяржаў фарміраваліся **саслоўна-прадстаўнічыя манархіі**.

Як вы лічыце, якія два саслоўі звычайна прыходзілі да аднаго і таго ж рашэння? На якое з іх кароль абапіраўся ў першую чаргу?

### Англійскі парламент

Найбольш развітая сістэма саслоўнага дзяржаўнага кіравання склалася ў найбуйнейшых заходнееўрапейскіх краінах — Англіі і Францыі. У парламенце Англіі прадстаўнікі гараджан і дваран утварылі ніжнюю палату (палату абшчын), а арыстакраты (людзі знатнага паходжання) — верхнюю (палату лордаў). Так у XIII ст. дзякуючы выданню Вялікай хартыі вольнасцей і стварэнню парламента ў Англіі пачала складвацца сістэма абмежаванай манархіі, якая існуе ў Вялікабрытаніі да нашага часу.

**Саслоўна-прадстаўнічая манархія** — форма праўлення, пры якой у кіраванні дзяржавай удзельнічаюць органы саслоўнага прадстаўніцтва.

### Французскія Генеральныя штаты

У Францыі дваранства і кароль лічылі гараджан ніжэйшым, падатковым саслоўем. Але і абысціся без гарадскіх фінансаў улада не магла. Генеральныя штаты складаліся з трох палат, у склад якіх уваходзілі прадстаўнікі трох саслоўяў: дваранства, духавенства і «трэцяга саслоўя» (гараджане, сяляне). Засядаючы паасобку, кожнае саслоўе фарміравала сваю думку па разгляданым пытанні, маючы пры

Вылучыце агульнае і адметнае ў рабоце саслоўна-прадстаўнічых органаў Англіі і Францыі.

гэтым адзін агульны голас. Канчатковае рашэнне прымалася на супольным сходзе. Пры гэтым гараджан звычайна прыцягвалі толькі дзеля таго, каб тыя пачулі волю манарха, звязаную з чарговым зборам падаткаў.

### Моц манархічнай улады

Для Позняга сярэднявечча было характэрнае ўзмацненне манархіі як з дапамогаю сілы, так і праз прыняцце законаў. Сама па сабе манархічная форма праўлення паўстала з традыцыі канцэнтравання ўлады ў адной асобы. У гэтым бачыўся залог устойлівасці, у аснове якой ляжала пэўная асаблівасць сярэдневяковага мыслення: як на чалавечым целе адна галава, так на чале дзяржавы адзіны валадар. Менавіта таму элементы грамадзянскай супольнасці, што ўзніклі ў заходнееўрапейскіх гарадах яшчэ ў XII–XIII стст., аказаліся слабыя і нетрывалыя. Аднаасобная ўлада манарха заставалася ў вачах народа арганізуючым пачаткам.

## ПРАВОДЗІМ МІНІ-ДАСЛЕДАВАННЕ

| *Англія* | *Францыя* | *Іспанія і Партугалія* | *Свяшчэнная Рымская імперыя* | *Вялікае Княства Літоўскае* |
|---|---|---|---|---|
| Парламент | Генеральныя штаты | Картэсы | Рэйхстаг | Сойм |
| ... | «асноўныя саслоўі» | ... | «сход» | ... |

*1. З дапамогай дадатковых крыніц інфармацыі выявіце этымалогію назваў саслоўна-прадстаўнічых органаў улады.*
*2. Як слова «сойм» звязана з назвамі аналагічных органаў у іншых дзяржавах?*
*3. Складзіце табліцу «Роля розных саслоўяў у кіраванні познесярэдневяковымі дзяржавамі». Зрабіце вывад.*
*4. Вялікі італьянскі мысляр і паэт Дантэ Аліг'еры пісаў: «Тое, што можа зрабіць адзін, лепш зрабіць аднаму, чым многім». Успомніце вядомую прыказку, якая прапануе альтэрнатыўны пункт погляду. Прывядзіце прыклады з гісторыі рэалізацыі кожнага сцверджання на практыцы.*

Феадалы як васалы і гараджане як падданыя маглі даваць парады валадару і ў асобных выпадках прымалі абавязковыя для яго рашэнні (напрыклад, усталяванне падаткаў).

Аднак Позняе сярэднявечча ведала прыклады існавання і рэспублік. Першыя з іх з'явіліся ў італьянскіх гарадах, такіх як Венецыя, Генуя, Фларэнцыя і інш. Умацаванне рэспубліканскіх ідэй праявіцца цягам развіцця Заходняй Еўропы ў Новы час.

**Італьянскія рэспублікі**

Успомніце, што такое рэспубліка.

**3. Асаблівасці фарміравання расійскай дзяржаўнасці.** У канцы XV — пачатку XVI ст. на палітычнай карце Еўропы з'явілася новая дзяржава — Расія, якую некаторы час яшчэ называлі Маскоўскім княствам, хоць у яе склад было ўключана некалькі іншых вялікіх княстваў.

**Вырашальная роля знешнепалітычнага фактару**

І калі на Захадзе ўтварэнне цэнтралізаваных дзяржаў было непасрэдна звязана з унутраным эканамічным развіццём — пашырэннем гандлёвых сувязей, фарміраваннем нацыянальных рынкаў, дык для Паўночна-Усходняй Русі галоўным быў знешні фактар. Аб'яднанне ўсходнеславянскіх зямель вакол Масквы было паскорана небяспекай, што зыходзіла ад Залатой Арды, а таксама ваенна-палітычнай канкурэнцыяй з боку Вялікага Княства Літоўскага. Уладары ВКЛ, таксама як і маскоўскія, разглядалі сваю дзяржаву як аб'яднанне ўсіх зямель былой Старажытнай Русі.



*Іван III (1462–1505) — стваральнік Расійскай дзяржавы — на помніку «Тысячагоддзе Расіі» ў Вялікім Ноўгарадзе*

Які сімвал расійскай дзяржаўнасці можна знайсці на помніку? Якім чынам Расія яго набыла?

Працэс умацавання каралеўскай улады ў Заходняй Еўропе патрабаваў падтрымкі розных палітычных сіл — феадалаў, царквы, гарадоў. Менавіта ў гарадах каралі знайшлі апору ў барацьбе з самавольствам феадалаў. На тэрыторыі Расійскай дзяржавы гарадское самакіраванне было амаль цалкам знішчана падчас цэнтралізацыі, скасавання асобных княстваў. Так, блізкія да рэспубліканскага ладу элементы арганізацыі ўлады, што існавалі ў Наўгародскай зямлі, былі ліквідаваны пасля далучэння «Гаспадара Вялікага Ноўгарада» да Масквы ў 1478 г.

Неабмежаваная ўлада манарха

У адрозненне ад сітуацыі ў Заходняй Еўропе, на час утварэння Расійскай дзяржавы ў ёй яшчэ не аформіліся саслоўі, якія баранілі б свае інтарэсы з дапамогай прадстаўнічых устаноў. Гэта паспрыяла набыццю вярхоўнай уладай Расіі нічым не абмежаванага самадзяржаўнага характару. Сам працэс стварэння адзінай Расійскай дзяржавы разглядаўся маскоўскімі валадарамі як пашырэнне ўласнага княства, сваёй вотчыны.

Працэсы цэнтралізацыі ў Расійскай дзяржаве паўсталі пачаткам замацавання сістэмы дзяржаўнага феадалізму. Для яго былі характэрныя развіццё прыгонніцтва і значная роля дзяржавы ў палітычнай і эканамічнай сферах.



*Уступленне султана Мехмеда II у Канстанцінопаль. Мастак Ж.-Ж. Бенжамен-Канстан. 1876 г.*

**4. Візантыя ў перыяд Позняга сярэднявечча.** У XIV–XV стст. у Візантыі ўзмацнілася права прыватнай уласнасці на зямельныя ўладанні, што прывяло да росту самастойнасці феадалаў, іх незалежнасці ад цэнтральнай улады. Афармляліся і правы сялян на зямлю, пры гэтым абшчына працягвала кантраляваць размеркаванне і продаж зямельных участкаў (надзелаў).

Аслабленне дзяржавы васілеўсаў

Новае аслабленне Візантыі адбылося тады, калі на Захадзе пачалі пераадольваць раздробленасць. Працяглая ўнутрыпалітычная барацьба аслабіла ўладу. Пагоршыла становішча Візантыі і яе суседства з качавым светам Усходу. Крыжовыя паходы спарадзілі канфлікты з каталіцкай Еўропай. Імперыя слабела штогод і эканамічна, і палітычна.

Заняпад Візантыі

Не здзіўляе, што з цягам часу Візантыя стала аб’ектам для знешняй агрэсіі. Спачатку яна трапіла пад уплыў італьянскіх купцоў, а затым зрабілася ахвярай турэцкай экспансіі. Падзенне Канстанцінопаля ў 1453 г. — смутны, але ў абставінах, якія склаліся, непазбежны фінал тысячагадовай гісторыі імперыі.

**5. Усходнія дэспатыі.** Галоўнай асаблівасцю палітычнага развіцця дзяржаў Усходу ў Познім

сярэднявеччы была моцная, абсалютная ўлада гасудара, якая грунтавалася на традыцыі і не патрабавала прававога афармлення. Усе, хто не меў дачынення да ўлады, з'яўляліся безаблічнай масай падданых, не мелі прававой абароны ад яе самавольства. Такая форма дзяржаўнага кіравання называецца дэспатыяй.

Успомніце, на чале якіх імперый стаялі Цімур і імператары дынастыі Мін.

**Прыродны фактар развіцця**

Гэтая асаблівасць палітычнага развіцця дзяржаў Азіі была абумоўлена ў першую чаргу манаполіяй дзяржавы на зямлю, а таксама залежнасцю ад прыродных умоў (сельская гаспадарка тут развівалася дзякуючы будаўніцтву ірыгацыйных сістэм). Па-другое, пастаянная знешняя пагроза (суседзямі земляробчых цывілізацый Усходу былі ваяўнічыя качэўнікі-жывёлаводы) вымушала будаваць абарончыя збудаванні і ўтрымліваць вайсковыя гарнізоны.

Калі і дзе ўпершыню ў гісторыі з'явіліся ірыгацыйныя сістэмы?

**Няма ўласнасці — няма правоў**

Вырашыць гэтыя задачы былі здольныя толькі моцныя цэнтралізаваныя дзяржавы. Асновай цэнтралізаванага кіравання грамадствам былі дзяржаўная форма ўласнасці, цэнтралізаваны збор падаткаў і такое самае размеркаванне. Лаяльнасць падданых забяспечвалася не дамовай, як на Захадзе (сеньёр васалу — зямлю, той у адказ — адданую службу), а адсутнасцю гарантаваных правоў падданых на валоданне зямлёй — асноўнай крыніцай існавання.

**Іншая Японія**

Сярод усходніх дзяржаў таго часу вылучалася Японія. «Нябесны гаспадар», як менавалі тут імператара, быў свяшчэнны, але ў рэальным жыцці не адыгрываў значнай ролі. Сапраўдную ўладу мелі феадальныя групы (сямейныя роды). У краіне існавала прыватная ўласнасць на зямлю, а самураі карысталіся асаблівай пашанай і павагай. Такое становішча захоўвалася ў Японіі да пачатку Новага часу.

*Палітычнае развіццё краін Захаду і Усходу ў Познім сярэднявеччы, з аднаго боку, мела агульныя рысы, галоўная з якіх — цэнтралізацыя ўлады. З другога боку, формы і прынцыпы кіравання аб'яднаных еўрапейскіх дзяржаў будаваліся на феадальных парадках, узаемнай зацікаўленасці і прававых гарантыях у адносінах «кароль — прадстаўнікі саслоўяў», у той час як улада на Усходзе моцна трымалася на традыцыйным беспярэчным падпарадкаванні манарху.*

**калі ў свеце…**

1265 г. — пачатак работы англійскага парламента

**на тэрыторыі Беларусі…**

1253 г. — каранацыя ў Новагародку вялікага князя літоўскага Міндоўга

**ПЫТАННІ І ЗАДАННІ**

1. Пералічыце прычыны зацікаўленасці манархаў і прадстаўнікоў розных саслоўяў ва ўтварэнні цэнтралізаванай дзяржавы.
2. Пабудуйце лагічны ланцужок, які адлюстроўвае працэс афармлення саслоўна-прадстаўнічых манархій у краінах Заходняй Еўропы. Вылучыце вартасці і недахопы органаў саслоўнага прадстаўніцтва, што існавалі ў XIV–XV стст.
3. Якія фактары паўплывалі на фарміраванне расійскай дзяржаўнасці? Прывядзіце канкрэтныя прыклады.
4. Чаму ўсходнія дзяржавы набылі форму дэспатый? Якім чынам на гэта маглі паўплываць традыцыйныя рэлігійныя вераванні і ўсходні светапогляд?